Пазіцыя

# «НАМ САНКЦЫІ НЕ ПАТРЭБНЫЯ!»

## Беларусы запісалі відэаролік працягласцю больш чым 30 гадзін

**У ім больш за пяць тысяч работнікаў з прадпрыемстваў усіх рэгіёнаў краіны і сфер эканомікі нон-стоп выказваюцца супраць санкцый.**

Для людзей відавочна, што санкцыі ЕС і ЗША ў першую чаргу ўдараць па іх заробках, пенсіях, дапамогах. Падобныя дыскрымінацыйныя меры абсалютна незаконныя і парушаюць адно з асноўных правоў чалавека — права на працу. Беларусы гатовыя абараняць гэтае права. Пра гэта яны дзеляцца з сябрамі, у працоўных калектывах, у сем'ях, выказваюць сваю пазіцыю ў сацыяльных сетках.

Пляцоўкай, якая аб'ядноўвае тых, хто стаміўся маўчаць і гатовы адстойваць сваю пазіцыю, стала Федэрацыя прафсаюзаў. На інтэрнэт-партале нацыянальнага прафцэнтра сабраныя тысячы меркаванняў людзей аб санкцыйнай палітыцы калектыўнага Захаду. Усе яны аб'яднаны ў больш чым 30-гадзінны відэаролік, які сёння накіраваны палітыкам краін Еўрасаюза, паведамілі ў прэс-службе ФПБ.

«Я — мама і хачу, каб у мяне была праца, каб я магла забяспечваць сваіх дзяцей, а дзеці жылі ў спакойнай краіне».

«Нам санкцыі не патрэбныя!»

«Заклікаем займацца сваімі праблемамі і не ўмешвацца ў справы нашай краіны».

«Я падтрымліваю тысячы маіх калег, суайчыннікаў. І хачу паглядзець у вочы тым, хто заклікае з-за мяжы да санкцый, і спытаць, як яны будуць глядзець у вочы сваім суайчыннікам, якія могуць застацца без працы, дзецям, якія могуць пазбавіцца будучыні».

«Пакіньце нас у спакоі! Дайце магчымасць спакойна працаваць!»

Усё гэта — словы простых людзей. Прамысловасць, энергетыка, хімічная галіна, адукацыя, ахова здароўя, сацыяльная і жыллёва-камунальная сферы, сельская і лясная гаспадаркі, сувязь, будаўніцтва, гандаль, транспарт салідарна выступаюць супраць незаконных абмежавальных мер, якія прымяняюцца да нашай краіны.

— Гэта тая праўда, якую заходнія палітыкі сёння наўмысна ігнаруюць і скажаюць. Гэтае тое, пра што яны імкнуцца змаўчаць. Яны сёння з высокіх трыбун заяўляюць пра тое, што нібыта самі беларусы выступаюць за ўвядзенне санкцый, нібыта ўсё гэта робіцца ў інтарэсах беларускага народа. Гэта відэа — выразны і зразумелы адказ на падобную хлусню, — падкрэсліў у Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. — Сёння відавочна, што заходнія чыноўнікі не збіраюцца лічыцца з меркаваннем людзей. У лютым Федэрацыя прафсаюзаў накіравала ў іх адрас больш за мільён 130 тысяч подпісаў работнікаў супраць санкцый. Але і сёння выразнага адказу на гэты салідарны і калектыўны запыт людзей няма. І зараз еўрачыноўнікі ў сваіх беззаконных дзеяннях па-ранейшаму прыкрываюцца людзьмі — нібыта разбурэнне нашай эканомікі ў іх інтарэсах. Але яны павінны ўбачыць праўду, якая застанецца ў гісторыі і будзе сведчаннем іх незаконнай і крывадушнай палітыкі.

Надвор'е

# На шэсць градусаў вышэй за норму

## У гэтыя дні ўначы будзе да 22 цяпла, а ўдзень «расплавіць» да плюс 36 градусаў

**Хоць мы ўжо знемагалі ад занадта гарачага надвор'я яшчэ на папярэднім тыдні, але, як аказалася, гэта была толькі падрыхтоўка да рэкорднай спякоты. І такое «чырвонае» надвор'е затрымаецца на тэрыторыі нашай краіны як мінімум да канца бягучага тыдня. Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды паведамляюць, што ў сярэднім па краіне другая дэкада ліпеня апынецца на 6 градусаў вышэйшая за кліматычную норму. Разам з тым не выключаны лакальныя кароткачасовыя навальнічныя дажджы.**



Менавіта кароткачасовыя дажджы і навальніцы пройдуць сёння ўдзень. Вецер будзе ўсходні, паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ў разгар дня чакаецца ад 29 цяпла да плюс 34 градусаў, у асобных раёнах паветра прагрэецца да плюс 35—36 градусаў са знакам плюс.

У сераду, уначы па паўночным захадзе, а ўдзень месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер будзе паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 16—22 градусаў, удзень — плюс 29—34 градусы вышэй за нуль, у асобных раёнах слупок тэрмометра пакажа 35—36 градусаў цяпла.

Таксама да максімальных тэмператур будзе награваецца паветра ў чацвер і пятніцу. У чацвер толькі месцамі па краіне магчымыя кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы не будзе апускацца ніжэй за 17—22 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да плюс 29—34 градусаў, а ў асобных раёнах — да плюс 35—36 градусаў. У пятніцу месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчыма, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 17—22 градусы. Удзень слупок тэрмометра паднімецца да плюс 28—34 градусаў, у асобных раёнах — да 35—36 градусаў вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прыёмная кампанія — 2021

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ БДУІР

**У сувязі з эпідэмічнай сітуацыяй БДУІР сёлета спросціць абітурыентам падачу дакументаў і звядзе чэргі ў прыёмнай камісіі да мінімуму. У асабістым кабінеце можна будзе ўвесці ўсю неабходную інфармацыю для фарміравання электроннай асабістай справы абітурыента (ацэнкі яго дакумента аб сярэдняй адукацыі, вынікі ЦТ, ільготы і г. д.) і запісацца на канкрэтны час падачы дакументаў.**

Старшыня прыёмнай камісіі Барыс Нікульшын паведаміў, што сёлета БДУІР аднаўляе падрыхтоўку па трох запатрабаваных спецыяльнасцях — «квантавыя інфармацыйныя сістэмы», «інфакамунікацыйныя тэхналогіі» і «радыёэлектронныя сістэмы», што абумоўлена запатрабаванасцю на рынку працы спецыялістаў, якія валодаюць ведамі ў галінах электроннай тэхнікі, сеткавай бяспекі і лічбавай апрацоўкі. Набор пройдзе на бюджэтную і платную формы навучання. На спецыяльнасці «радыёэлектронныя сістэмы» студэнтаў будуць рыхтаваць у галіне інтэлектуальных радыёэлектронных сістэм, а таксама яны будуць вывучаць сістэмы радыёлакацыі і радыёнавігацыі.

Студэнты спецыяльнасці «квантавыя інфармацыйныя сістэмы» будуць вывучаць у тым ліку нана-тэхналогіі, якія цяпер запатрабаваныя ва ўсім свеце. На спецыяльнасці «інфакамунікацыйныя тэхналогіі» маладыя людзі навучацца вырашаць задачы стварэння, перадачы, апрацоўкі, захоўвання і абароны інфармацыі.

«Квантавыя інфармацыйныя сістэмы», «інфакамунікацыйныя тэхналогіі» і «радыёэлектронныя сістэмы» папоўняць спіс спецыяльнасцяў, з якога абітурыенты выбіраюць і расстаўляюць свае прыярытэты пры падачы дакументаў у БДУІР. Калі яны не праходзяць па сваіх балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то будуць удзельнічаць у конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей. Сёлета ў спісе будзе 34 спецыяльнасці.

— Гэта вельмі важны момант, на які абітурыенты часта не звяртаюць увагі. Чым больш яны згадваюць спецыяльнасцяў у сваёй заяве, тым больш шанцаў у іх паступіць у БДУІР. Прычым абітурыент пры падачы дакументаў можа падаць адразу дзве заявы: на бюджэтную і платную формы навучання. Пры гэтым пералік спецыяльнасцяў, іх колькасць і прыярытэты могуць быць розныя для дзвюх заяў. У выпадку непаступлення на бюджэт заява будзе ўлічана ў конкурсе на платную форму навучання, што не запатрабуе дадатковага візіту ў прыёмную камісію, — растлумачыла **начальнік аддзела суправаджэння прыёмнай камісіі БДУІР Паліна САКАЛОЎСКАЯ.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Класныя навіны

# Пакуль без нечаканасцяў

## На выхадзе са школы — чатыры экзамены

**Пастановай Міністэрства адукацыі ўстаноўлены пералік экзаменаў для навучэнцаў 9 і 11 класаў школ у 2021/2022 навучальным годзе. Пакуль што ніякіх нечаканасцяў для выпускнікоў у гэтым дакуменце няма.**

Згодна з ім, па завяршэнні базавай школы навучэнцы будуць здаваць у пісьмовай форме тры абавязковыя іспыты: «Беларуская мова», «Руская мова» і «Матэматыка».

Акрамя таго, для навучэнцаў класаў, у якіх навучанне і выхаванне вядуцца на мове нацыянальнай меншасці — польскай ці літоўскай, — нароўні з вышэйпералічанымі прадметамі абавязковым іспытам з'яўляецца экзамен «Польская мова» або «Літоўская мова» ў пісьмовай форме.

Для вучняў творчых устаноў агульнай сярэдняй адукацыі разам з асноўнымі экзаменамі ў пастанове вызначаны выпускны экзамен на выбар (у практычнай форме) па адным з вучэбных прадметаў, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцяў у галіне асобных відаў мастацтваў.

Для навучэнцаў 11 класаў абавязковымі з'яўляюцца наступныя экзамены: «Матэматыка» ў пісьмовай форме, «Беларуская мова» або «Руская мова» па выбары вучня ў пісьмовай форме, «Замежная мова» ў вуснай форме і «Гісторыя Беларусі» ў вуснай форме.

Для навучэнцаў класаў нацыянальных меншасцяў дадаткова «Польская мова» або «Літоўская мова» ў пісьмовай форме, а для навучэнцаў творчых устаноў — практычны выпускны экзамен па выбары, накіраваны на развіццё іх творчых здольнасцяў.

Нагадаем, што аб'яднанне выпускных экзаменаў у школе з уступнымі экзаменамі ў ВНУ абмяркоўваецца ўжо не першы год. Таксама Міністэрства адукацыі прапаноўвала выстаўляць у атэстат адзінаццацікласнікам толькі тую адзнаку, якая будзе атрымана па выніках здачы нацыянальнага экзамену. Але гэта прапанова сустрэла супраціўленне з боку настаўнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Разумнікі і разумніцы

# Экалогія, навука + англійская мова

**У фінале Міжнароднага конкурсу навукова-даследчых і прыкладных праектаў навучэнцаў па захаванні водных рэсурсаў «Стакгольмскі юніёрскі водны прыз», які пройдзе са жніўня да верасня, Беларусь прадстаўляць навучэнцы барысаўскай сярэдняй школы № 23 Ганна Ціхановіч і Ягор Касянік.**

Гэта права яны заваявалі ў выніку перамогі ў рэспубліканскім водным конкурсе даследчых праектаў, які праводзіўся Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства пры падтрымцы ўнітарнага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь».

У нацыянальным конкурсе было прадстаўлена 106 праектаў, прысвечаных ахове водных рэсурсаў. Іх аўтарамі сталі 112 школьнікаў ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў з розных гарадоў Беларусі. Тым, хто прайшоў адбор у фінальны тур, неабходна было абараніць свае навуковыя распрацоўкі і даследаванні перад журы ў 15-хвілінным анлайн-выступленні, прычым на англійскай мове. У выніку самую высокую ацэнку атрымаў праект «Выкарыстанне раслінных матэрыялаў у якасці сарбентаў нафтапрадуктаў» — менавіта такую тэму абралі для свайго даследавання барысаўскія школьнікі Ганна Ціхановіч і Ягор Касянік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Афарміла крэдыт на 5000 рублёў

## і перавяла іх... ашуканцам

**Мінчанка з дапамогай інтэрнэт-месенджара патэлефанавала жанчына, якая прадставілася работнікам банка. Пад падставай пагашэння крэдытнага дагавора, які нібыта быў афармлены на імя пацярпелай, махлярка ўгаварыла ўзяць яшчэ адзін крэдыт для пагашэння старога і перавесці грашовыя сродкі ў памеры 5000 рублёў праз інфакіёск.**

Махлярка кансультавала пацярпелую, прасіла паведамляць пра коды, якія прыходзілі ёй у SMS-паведамленнях. Пацярпелая камунікавала з ашуканцамі на працягу некалькіх дзён. Западозрыла жанчына, што стала ахвярай махляроў, калі ёй паўторна патэлефанавалі і паведамілі, што на яе афармлены ўжо чатыры крэдыты, паведамляе падрабязнасці крымінальнай гісторыі ГУУС Мінгарвыканкама.

Сума шкоды склала 5000 рублёў. Па дадзеным факце праводзіцца праверка, датычныя да здзяйснення злачынства асобы высвятляюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**